# ВЫХАВАЎЧАЯ РОЛЯ ГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**Скачкова В.А.**

Асноўнай мэтай вышэйшай прафесійнай адукацыі з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў у розных галінах дзейнасці. Вырашаючы праблему папаўнення прафесійных кадраў, дзяржава не пакідае без увагі і пытанне фарміравання асобы будучага спецыяліста як не толькі паўнавартаснага члена грамадства, але і як грамадзяніна, паўнавартаснага суб'екта грамадска-палітычнага жыцця, будучага лідара, палітыка, грамадскага дзеяча. Вядома, што адукацыя без выхавання не здольная сфарміраваць кваліфікаванага спецыяліста, прафесіянала і грамадзяніна. Менавіта цыкл гуманітарных дысцыплін у вышэйшай навучальнай установе ў той ці іншай меры рэалізуе задачу фарміравання патрыятызму і нацыянальнай свядомасці ў студэнтаў.

Патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі заключаецца ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці і адказнасці за лёс Беларусі; выхаванні любові да роднай зямлі, яе гісторыі, у аднаўленні і захаванні гістарычнай памяці; культываванні лепшых рыс беларускай ментальнасці (працавітасці, талерантнасці, стрыманасці, індывідуальнай свабоды, глыбокай сувязі з прыродай і інш.); выхаванні беражлівых адносін да нацыянальнага багацця краіны, мовы, культуры, традыцый.

Нацыянальнае выхаванне – гістарычна абумоўленая і створаная самім народам сістэма ідэй, поглядаў, перакананняў, ідэалаў, традыцый, звычаяў і іншых форм сацыяльнай практыкі. Сістэма патрыятычнага выхавання павінна грунтавацца на ідэях нацыянальнага светапогляду, філасофіі, ідэалогіі, на прынцыпах сямейнага выхавання, народнай педагогікі, навуковай педагагічнай думкі, якія ўвабралі ў сябе ўсё багацце народнай мудрасці. Яна павінна ахопліваць ідэйнае багацце народа, яго маральна-эстэтычныя каштоўнасці.

Патрыятычнае выхаванне не супрацьпастаўляецца, а арганічна дапаўняецца нацыянальным і інтэрнацыянальным выхаваннем. У працэсе

патрыятычнага выхавання культывуюцца лепшыя рысы беларускай ментальнасці – любоў да Беларусі, працавітасць, індывідуальная свабода, сувязь з прыродай, шчырасць і дабрыня, гасціннасць, павага да родных і інш.

Значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці студэнтаў маюць такія навучальныя дысцыпліны, як "Беларуская мова (прафесійная лексіка)", "Гісторыя Беларусі", "Гісторыя культуры Беларусі, "Паліталогія", "Сацыялогія", правазнаўчыя навукі і іншыя. Кожная з названых дысцыплін мае сваё асобнае канкрэтнае месца і задачы ў сістэме фарміравання патрыятызму і нацыянальнай свядомасці ў вну.

Выхаваўчыя мэты курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" заключаюцца ў фарміраванні чалавека культурнага, інтэлігентнага, які ведае і любіць не толькі родную мову, але і мову народа, сярод якога жыве, паважае гэты народ, цікавіцца яго звычаямі, культурай, гісторыяй. Зыходзячы з гэтага, выкладчык падбірае дыдактычны матэрыял сацыякультурнага характару з улікам наступных патрабаванняў: матэрыял павінен мець пазнавальнае, эстэтычнае і выхаваўчае значэнне. Дзякуючы гэтаму фарміруецца сацыякультурная кампетэнцыя студэнтаў. Рэалізуюцца выхаваўчыя мэты праз навучальныя прыёмы і сродкі, накіраваныя на аналіз і ўсведамленне ідэйна-маральнага, этычнага або эстэтычнага значэння тэкстаў, малюнкаў, карцін.

Вывучэнне курса "Гісторыя Беларусі" дапаможа студэнту ўсебакова аналізаваць гістарычныя працэсы, падзеі, і факты, тлумачыць іх, рабіць уласныя абгрунтаваныя высновы, выказваць сваё стаўленне да гістарычных падзей, дзяржаўных дзеячаў, а таксама прымаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, мець выразную грамадзянскую пазіцыю. Гістарычныя веды важныя не толькі самі па сабе, але і тым, да якіх перакананняў яны вядуць, наколькі гэтыя веды спрыяюць станаўленню асобы, фарміраванню яе палітычнай культуры, нацыянальнай свядомасці, патрыятызму і ідэнтыфікацыі – усведамленне сваёй прыналежнасці да беларускага народа.

Гісторыя культуры Беларусі з'яўляецца часткай гісторыі сусветнай культуры, асаблівай яе галіной. Вытокі гэтага самабытнага феномену сыходзяць у далёкае мінулае, а крышталізацыя яго адметнасці, непаўторнасці – гэта гістарычны працэс праяўлення асаблівасцей менталітэту і адлюстраванне адносін прабацькоў, бацькоў і сучаснікаў да свайму быцця, да супярэчлівага лёсу свайго народа. На сучасны момант вельмі важным з'яўляецца азнаямленне студэнтаў з гісторыяй нашай культуры, з спецыфікай жыцця беларускага народа і з яго традыцыямі, з імёнамі беларускіх культурных дзеячаў.

Усё гэта дае магчымасць будучаму спецыялісту правільна разумець і ўмець тлумачыць феномен культуры, яе ролю ў чалавечай жыццядзейнасці, ведаць формы і тыпы культуры і яе галоўныя дасягненні ў развіцці вядучых краін свету, а таксама ведаць гісторыю айчыннай культуры, яе месца ў сістэме сусветнай цывілізацыі.

Вышэйшая школа мае шырокае поле дзейнасці для палітычнай адукацыі. Найбольш распаўсюджаным цяпер у беларускіх вну з'яўляецца курс “Паліталогія”. Важнасць гэтага прадмета заключаецца ў тым, што без яго немагчыма фарміраванне ў студэнтаў належнага ўзроўню палітычнай культуры, норм кансэнсусных адносін у складаных ўмовах трансфармацыйных змен. Задачы паліталогіі — фарміраванне ведаў аб палітыцы, палітычнай дзейнасці; тлумачэнне і прадказанне палітычных працэсаў і з'яў палітычнага развіцця; распрацоўка канцэптуальнага апарату паліталогіі, метадалогіі і метадаў палітычнага даследавання.

Курс “Сацыялогія” ў вышэйшай школе займае ў структуры палітычнага выхавання студэнтаў важнае месца. Вывучэнне сацыялогіі дае магчымасць студэнтам усвядоміць сваё месца ў сацыяльнай структуры грамадства.

Вывучаючы прававыя дысцыпліны, студэнт пазнае, калі і як з'явілася права, як ствараюцца законы, як фарміравалася незалежная беларуская дзяржава, а галоўнае, па якіх законах яна жыве цяпер. Значны ўплыў на фарміраванне дэмакратычнай палітычнай культуры будучых спецыялістаў

мае вывучэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Зразумела, што без ведання Асноўнага закона дзяржавы малады чалавек не рэалізуецца як спецыяліст і грамадзянін.

Пры фарміраванні нацыянальнай свядомасці важна не быць ізаляванымі, а наадварот, несці беларускую нацыянальную ідэю ў розныя супольнасці, краіны і культуры. Гэта спрыяе фарміраванню ў студэнтаў нацыянальнай пазіцыі, годнасці, пачуцця гонару за дасягненні ў краіне і ўсведамленне ролі беларускага народа ў сусветнай гісторыі.

Важнай крыніцай фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці сучаснага студэнцтва з'яўляюцца абрады, звычаі і рытуалы беларускага народа: маладыя людзі у значнай ступені арыентуюцца на захаванне традыцыйных форм паводзін у час святкавання важных жыццёвых падзей. Духоўная культура беларускага народа таксама адыгрывае даволі важную ролю ў жыцці яго маладых прадстаўнікоў як кансалідуючы фактар, на аснове якога ўзнікае ўсведамленне дачынення да сваёй нацыянальнай супольнасці.

Трэба адзначыць, што вялікую ролю пры выкладанні гуманітарных дысцыплін адыгрывае узровень прафесійнай падрыхтоўкі выкладчыкаў, якасць адукацыйных праграм, методыка навучання, вучэбная літаратура, тэхнічныя сродкі навучання. На выкладчыкаў ускладаецца вялікая адказнасць навучыць моладзь выпрацаваць уласную грамадзянскую пазіцыю, любіць і ведаць сваю гісторыю і культуру, паважаць культуру іншых народаў.